САЦЫЯЛЬНАЯ АДАПТАЦЫЯ

# ГЕНДЭРНЫЯ РОЛІ: САЦЫЯЛЬНЫ АСПЕКТ

## ФАРМІРАВАННЕ АСНОЎ ГЕНДЭРНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ДАШКОЛЬНЫМ УЗРОСЦЕ

Таццяна ШАЎЛЮК

**Поспех у выхаванні і навучанні ў значнай ступені залежыць ад таго, як дасканала наладжана педагагічнае ўзаемадзеянне, наколькі разнастайныя яго функцыі. Выхавальнік для дзіцяці — і носьбіт пэўнай інфармацыі, і чалавек, які аказвае пэўны ўплыў, і арганізатар, кіраўнік дзейнасці, і прыклад жаночых (калі педагог мужчына — мужчынскіх) паводзін. Сёння надзвычай актуальным з'яўляецца фарміраванне асноў гендэрнай культуры.**

ГЕНДЭРНАЯ ідэнтычнасць фарміруецца ў дзяцей ва ўзросце 5—7 гадоў, а ў далейшым ідзе яе развіццё і змястоўнае насычэнне праз вопыт і практыку. Часам дарослыя недаацэньваюць важнасць дашкольнага перыяду для іх псіхасексуальнага развіцця. Сям'я з'яўляецца першай сферай поларолевай сацыялізацыі.



**Таццяна Станіславаўна ШАЎЛЮК, выкладчык, магістр адукацыі.**

**Закончыла факультэт дашкольнага выхавання БДПУ імя М. Танка (1996 г.), бакалаўрыят (1996 г.), магістратуру (1997 г.). Кола навуковага пошуку — гендэрная псіхалогія. Працуе над дысертацыяй на званне кандыдата псіхалагічных навук.**

*Гендэр* — сацыяльны пол, адрозненні паміж мужчынамі і жанчынамі, якія залежаць не ад біялагічных, а ад сацыяльных умоў (грамадскі падзел працы, спецыфічныя сацыяльныя функцыі, культурныя стэрэатыпы і г. д.). Гендэр — гэта сацыяльнае вымярэнне полу, сацыякультурны феномен, які вызначае, што такое быць мужчынам ці жанчынай у тым або іншым грамадстве.

Першасная полавая ідэнтычнасць, ці усведамленне сваёй полавай прыналежнасці, фарміруецца ў дзіцяці ўжо ў 1,5 года. З узростам аб'ём і змест гэтай ідэнтычнасці мяняецца. Двухгадовае дзіця ведае свой пол, але не ўмее абгрунтаваць гэтую прыналежнасць. У 3—4 гады яно ўсведамляе розніцу полу, але асацыіруе са знешнімі прыкметамі (з аддзеннем). У 6—7 гадоў канчаткова ўсведамляе незваротнасць полавай прыналежнасці, прычым гэта супадае з узмацненнем полавай дыферэнцыроўкі паводзін. І хлопчыкі, і дзяўчынкі перавагу аддаюць аднаполым кампаніям.

У апошні час назіраецца трывожная тэндэнцыя — хлопчыкі ў ходзе тыповага фемінізаванага выхавання пераходзяць з адных «жаночых рук» у іншыя (маці — выхавальніца — настаўніца). Колькі б ні чуў хлопчык, якім павінен расці мужчына, ён выхоўваецца перш за ўсё як «зручны ва ўзаемадзеянні» для жанчын.

Неабходна правільна арганізаваць працэс выхавання ў дашкольнай установе, каб спрыяльныя ўмовы дапамагалі ўдала і мэтанакіравана фарміраваць міжасабовыя зносіны рознаполых дзяцей і засваенне імі гендэрнай культуры.

Для рэалізацыі пастаўленай задачы можна выкарыстоўваць наступныя формы, прыёмы і метады выхаваўчай работы:

✓ ***Узаемадзеянне з сям'ёй:***

- *бацькоўскі універсітэт (азнаямленне бацькоў з асновамі гендэрнай культуры, гутаркі па дадзенай тэматыцы: «Сям'я — галоўны выхавальнік маральна-полавых паводзін», «Гендэрныя стэрэатыпы», «Як весці гутарку з дзіцем аб асаблівасцях полу?»;*
- *тэматычныя бацькоўскія сходы з запрашэннем спецыялістаў.*

✓ ***Работа псіхолага дашкольнай установы:***

- *індывідуальныя і групавыя кансультацыі псіхолага па пытаннях гендэрнай сацыялізацыі і культуры.*

✓ ***Агульнасадавыя мерапрыемствы:***

- *мама — пачатак усіх пачаткаў;*
- *пасвячэнне ў рыцары;*
- *калі б я быў дзяўчынкай і інш.*

**Для аптымізацыі зносін хлопчыкаў і дзяўчынак можна выкарыстоўваць:**

- *сюжэтныя карцінкі, дзе адлюстраваны розныя ўзаемаадносіны хлопчыкаў і дзяўчынак. Выхавальнік заахвочвае дзяцей выказаць свае адносіны да падзей, ацаніць паводзіны персанажаў;*
- *рашэнне праблемных маральных сітуацый з дзецьмі (учынкі хлопчыкаў у адносінах да дзяўчынак і наадварот). Гэта спрыяе таму, што правілы, якія рэгулююць адносіны паміж дзецьмі, дзеянні самога дзіцяці становяцца аб'ектам непасрэднай увагі. Пры гэтым дзіця імкнецца знайсці рашэнне ў пэўнай сітуацыі. Неабходна, каб дзеці знаходзілі правільнае рашэнне і маглі патлумачыць яго выбар;*
- *эфектыўным метадам з'яўляецца этычная гутарка (падбіраюцца сюжэты, дзе паказаны ўзаемаадносіны хлопчыкаў і дзяўчынак, розныя ўчынкі дзяцей);*
- *сюжэтныя гульні з ролямі, якія ўлічваюць інтарэсы і хлопчыкаў, і дзяўчынак;*
- *лялечны тэатр. Ён дае магчымасць выхавальніку данесці да дзяцей этычныя каштоўнасці ўзаемаадносін паміж хлопчыкамі і дзяўчынкамі. Дзеці не толькі ацэньваюць паводзіны персанажаў, а і ўяўляюць сябе на іх месцы.*

Такім чынам, задачы поларолевага выхавання рашаюцца на аснове мэтазгоднага выбару метадаў і прыёмаў, іх удалага спалучэння.

Выхавальнікі і бацькі павінны заахвочваць дзяцей засвойваць усё лепшае з абедзвюх гендэрных роляў. Незалежнасць, упэўненасць, клопат і тактоўнасць — каштоўныя і карысныя рысы для ўсіх людзей, а не толькі для хлопчыкаў ці для дзяўчынак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ